# На Новы Год.

У гэты дзень звычай вымагае абярнуцца назад, каб акінуць вокам прамінулы год і пажадаць сабе лепшай долі ў будучыне.

Сумна і з трывогай пачынаўся леташні год. Беларускі рух быў задушаны. Страшная навальніца з Усходу параскідала была ўсе здабыткі, нажытые політычнай і культурнай працай беларускай думкі. Політычные і культурные сілы, прымаўшые чыннае учасьце ў дзяржаўным будаўніцтве свае бацькаўшчыны, былі прымушаны пакінуць родны край з прычыны абвяшчэньня іх без абароны закону. Прыход бальшавіцкай уласьці, чужой для беларусаў і па нацыянальнасьці і па духу, суліў нашаму зруйнаванаму вайною краю новую руіну, а народу эконаміцкі развал, голад і бязладзьдзе. З прычын незалежных ад яго акалічнасяй, Беларускі народ ня меў магчымасьці аружнай сілай бараніцца ад маскоўскіх наезьнікаў, нахлынуўшых на нашую зямлю з абяцанкамі комунізму. І як-бы ў насьмешку і на зьдзек, посьле разгону ўсіх беларускіх сіл, але прымушаные лічыцца з тым, што было зроблено дзеля умацаваньня сувэрэнных праў двананцацімільёнага Беларускага народу, бальшавікі, па прыказу з Маскву, дзеля сваіх політычных міхінацый, маніфэстам з 1-га студзеня 1919 г. аб'явілі Беларусь незалежнай Раднай (савецкай) Рэспублікай у фэдэрацыйнай сувязі з Маскоўшчынай.

Сыстэма савецкага упраўленьня хутка пачала даваць свае атручваючые плады. Хтка прыпынілося ўсякае грамадзянскае і культурнае жыцьце. Школы, ўсе грамадзянскіе небальшавіцкіе установы былі пазачынены; гандлёвы і прамысловы рух прыпыніўся, залезные дарогі сталі, падвоз тавараў абарваўся; хлеб і іншые рэчы першай патрэбы зьнiклі дазваньня. Пачаўся голад, пашлі хваробы, а ўсе жывые сілы краю апанавала роспач. Маладые і больш рухавые сілы пакідалі сялібы ды йшлі ў „зялёную армію“, каб хоць з лесу, с-пад цішка наносіць раны ворагу, укінуўшаму наш край у мора пакуты, крыві і гвалту. А рэшта насяленьня моўчкі зносіла крывавае бальшавіцкае панаваньне, з верай і надзеяй ловячы ўсякіе чуткі аб пераменах, каторые прынесьлі-б яму збаўленьне.

Гэтак час прайшоў аж да пачатку жніўня. 8-га жніўня польскіе войскі занялі Менск, і частка Беларусі па Бярэзіну была ачышчана ад бальшавікоў. Шмат хто палохаўся польскай улады, шмат хто адкрыта вітаў яе прыход, а разам-усе былі рады новай перамене, што збавіла іх ад бальшавіцкай навалы, і ў сэрцы казалі: „Дарма, абы не маскаль!“ І—заварушылося жыцьце...

Пачалі зьбірацца беларускіе сілы. Быў выданы прыказ, што беларуская мова можа офіцыяльна ужывацца ва усіх урадовых установах побач з польскай. На вуліцах з запалам чыталася адозва начальніка польскай дзяржавы да насяленьня быўшага вялікага Княжства Беларуска-Літоўскага аб тым, што „на гэтай, бытцам забытай праз Бога, старонцы павінны запанаваць воля ды правы слабоднай, нічым ня зьвязанай гутаркі аб жаданьнях і патрэбах“, што польскае войско прыводзіцца да нас дзеля таго, „каб скінуць гаспадараваньне гвалту і сілы, *каб спыніць кіраваньне краем проці волі насяленьня*“, што даецца нам „магчымасьць разьвязаць унутраные, нацыянальные і рэлігійные справы так, як самі захочаце. *бяз ніякага гвалту або уціску збоку Польшчы*“...

Заварушыліся мары, надзеі, спадзяванкі. Пачаліся спробы выглажыць у жыцьце і зьдзейсьніць хоць частку з таго, што дэкларавалося, але заміж таго, каб „спыніць кіраваньне краем проці волі насяленьня“, пайшлі плебісцыты, прылучаньне да Польшчы, палёнізацыя і т. д. і т. д., а на рэшце—такое нездаваленьне беларускага насяленьня польскаю уладай, якога трудна сабе выабразіць...

Як мала пражыта, як многа пережыта! Але—бяда хоць мучыць, да жыць вучыць. Цяпер апошні селянін нашай цёмнай, няшчаснай вёскі мусіў зауважыць, што ніхто ня дасьць нам паратунку, калі мы са-

мі сабе не паратуем. Цяпер кожнаму зразумело, што толькі утварэньне свайго беларускага гаспадарства, што толькі адбудаваньне незалежнай Беларускай дзяржавы зможа палажыць канец гэтаму перакіданьню нашага народу з абоймаў у абоймы.

А для нас у гэты дзень, што становіць пачатак новаму колу Новага Году і бяз *гаданьняў* павінна быць ясна, што покі мы ня усьведамім народу свайго нацыянальна, покі ён будзе спадзявацца паляпшэньня свае горкае долі не ад самога сябе, а ад таго, што нехта прыдзе і вызваліць яго з нядолі, — датуль мы пастаянна будзем сустрачаць новые годы тымі словамі, якімі сустрачаем сягодня.

Дык—за працу! Пойдзем у народ, панясом яму сьвятло *беларускай* праўды і *беларускай* справядлівасьці; пойдзем сказаць яму, што „ніхто ня дасьць яму збаўленьня, — ні бог, ні цар, і не гярой; дабьемся мы аслабаненьня сваею ўласнаю рукой“.

Адзін у нас паратунак, адна дарога: праз нацыянальнэе усьвядамленьне—да незалежнай і непадзельнай Беларускай дзяржавы.